***Мурашка Н. У.***, *настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 196 г. Мінска, аспірант Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, магістр;*
***Шылава А. С.***, *дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук*

# Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў: тэхналогія «Піла» на ўроках беларускай мовы ў III класе

Працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на ўроках беларускай мовы карпатлівы і патрабуе пэўных намаганняў з боку не толькі настаўнікаў, але і навучэнцаў. Акрамя таго, на ўроках неабходна ствараць такія ўмовы для навучэнцаў, каб тут і цяпер яны авалодвалі яшчэ і новымі ведамі ў рамках розных кампетэнцый. У такім выпадку трэба шукаць варыянты правядзення ўрокаў, калі ствараюцца ўмовы не толькі для разумення, асэнсавання, запамінання, замацавання новага матэрыялу навучэнцамі з рознымі ўзроўнямі матывацыі, але адначасова і для моўнай практыкі **кожнага** вучня на **кожным** уроку.

Для вырашэння гэтых задач падыходзіць тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве, якая з'яўляецца альтэрнатывай традыцыйнаму навучанню на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі на аснове атрымання гатовых ведаў і іх узнаўлення, а таксама садзейнічае фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў.

Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве прадугледжвае розныя варыянты з шырокімі магчымасцямі навучання ў малодшым школьным узросце:

- «Навучанне ў камандзе» (Student Team Learning — STL);
- «Піла» (Jigsaw);
- «Вучымся разам» (Learning Together) [1].

У папярэдніх артыкулах мы ўжо разглядалі магчымасці выкарыстання варыянта *тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Навучанне ў камандзе»* на ўроках беларускай мовы [2] і літаратурнага чытання [3]. У прапанаваным артыкуле мы разгледзім ***варыянт тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Піла»*** на ўроках беларускай мовы.

Гэты варыянт быў распрацаваны прафесарам Эліётам Аронсанам у 1978 г. і названы «Jigsaw», што ў перакладзе з англійскай мовы азначае 'ажурная піла' або 'машынная нажоўка'. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі яго мэтазгодна выкарыстоўваць для працы на ўроках у III–IV класах, паколькі падчас яго рэалізацыі навучэнцы павінны ўмець самастойна, без дапамогі настаўніка, выконваць усе заданні.

Разгледзім **алгарытм рэалізацыі** варыянта тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве **«Піла»***:

**1.** Навучэнцы дзеляцца на каманды па шэсць чалавек для працы з вучэбным матэрыялам, які разбіты на пэўныя пытанні адной тэмы.

**2.** Удзельнікам кожнай каманды прапануюцца для выканання заданні па пэўных пытаннях адной тэмы.

**3.** Кожны ўдзельнік каманды працуе над сваім заданнем па адным з пытанняў тэмы.

**4.** «Сустрэча экспертаў». Навучэнцы з розных каманд, якія працуюць над адным і тым жа заданнем, перамяшчаюцца, збіраюцца ў новыя групы і абменьваюцца інфармацыяй па выкананні свайго задання, паўтараючы пры гэтым спачатку тэарэтычны матэрыял, а затым і алгарытм выканання практычнага задання. Пасля таго як заданне было абмеркавана і выканана, усе вучні группы становяцца экспертамі ў гэтым заданні.

**5.** Эксперты (усе навучэнцы) вяртаюцца ў свае першапачатковыя каманды пасля таго, як абмеркавалі ўсе магчымыя цяжкасці, выявілі памылкі і прычыны іх узнікнення, выправілі іх і пры гэтым паўтарылі тэарэтычны матэрыял.

**6.** Кожны ўдзельнік каманды тлумачыць па чарзе спачатку неабходнае правіла, якое ён выкарыстаў пры выкананні задання, а затым алгарытм выканання ўсіх дзеянняў пры выкананні свайго задання.

**7.** Усе астатнія навучэнцы ў камандзе ўважліва слухаюць тлумачэнне выкананага задання сваіх

* У электронным дадатку гл. мультымедыйную прэзентацыю.

партнёраў, па ходзе тлумачэння робяць запісы ў сшытках. Калі нешта незразумела, задаюць выступоўцу пытанні па ходзе яго тлумачэння.

**8.** Падвядзенне вынікаў. Пры падвядзенні вынікаў настаўнік можа папрасіць некалькіх вучняў з розных каманд выканаць любое з прапанаваных заданняў.

**9.** Рэфлексія якасці засваення матэрыялу, сумеснай дзейнасці і ўзаемадзеяння ў камандзе і ў групах.

Пакажам магчымасці рэалізацыі варыянту тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Піла» на ўроках беларускай мовы ў III класе падчас замацавання тэмы «***Род назоўнікаў***».

**Першы этап.** Настаўнік размяркоўвае навучэнцаў на каманды па шэсць чалавек. У кожнай камандзе выбіраецца капітан альбо яго прызначае настаўнік. Пажадана, каб гэта быў вучань з высокім узроўнем матывацыі. Удзельнікам кожнай каманды прысвойваюцца нумары: 1, 2, 3, 4, 5, 6.

**Другі этап.** Удзельнікам кожнай каманды прапануюцца для выканання заданні па пэўных пытаннях адной тэмы. Настаўніку трэба загадзя падрыхтаваць заданні, дыферэнцыраваныя па складанасці, таму што ў кожнай камандзе прысутнічаюць навучэнцы з рознымі ўзроўнямі матывацыі, і прадумаць, якія заданні прапанаваць навучэнцам з нізкім узроўнем матывацыі, якія — з сярэднім і з высокім, каб для ўсіх стварыць сітуацыю поспеху пры іх выкананні.

Заданні ***№ 1*** і ***2*** мэтазгодна прапанаваць навучэнцам з ***нізкім*** узроўнем матывацыі; ***3*** і ***4*** — з ***сярэднім***; ***5*** і ***6*** — з ***высокім*** узроўнем матывацыі.

Заданні для каманд можна запісаць на дошцы, размясціць на слайдзе ці ў канверце на картках.

**1.** ***Заданне для ўсіх навучэнцаў, незалежна ад прысвоенага ім нумара.***

Як вызначаецца род назоўнікаў?

**2.** Вызначы род назоўніка і знайдзі лішняе слова.

**№ 1:** дзядзька, тата, верталёт, хлопчык, <u>дачка</u>;

**№ 2:** плыўчыха, настаўніца, <u>лісяня</u>, артыстка, ткачыха;

**№ 3:** сланяня, акно, паветра, <u>боль</u>, вясло;

**№ 4:** подпіс, <u>ваўчаня</u>, сабака, унук, яблык;

**№ 5:** жырафа, бабуля, <u>сабака,</u> гусь, лодка;

**№ 6:** певень, боль, медаль, яблык, <u>гусь</u>.

**Трэці этап.** Капітаны каманд з дапамогай настаўніка размяркоўваюць, якое заданне будзе выконваць кожны з навучэнцаў.

Удзельнікі каманды працуюць самастойна над сваім заданнем наступным чынам:

– спачатку навучэнцы павінны ўспомніць правіла, як вызначаецца род назоўнікаў;

– згадаць назоўнікі, род якіх у беларускай мове не супадае з рускай мовай;

– затым вызначыць род прапанаваных назоўнікаў і закрэсліць лішняе слова.

**Чацвёрты этап.** Навучэнцы, якія працуюць над адным і тым жа заданнем, але ў розных камандах, перамяшчаюцца і збіраюцца ў новыя групы. Гэта адбываецца наступным чынам: вучні, якія выконвалі заданне ***№ 1***, збіраюцца за адным сталом і ўтвараюць новую групу, якая называе род усіх назоўнікаў, запісаных у заданні № 1, і адказвае на пытанне «***Якое слова ў радку лішняе і чаму***?». Так працуюць астатнія вучні, што выконвалі заданні ***№ 2–6***.

У кожнай новай групе праца навучэнцаў адбываецца наступным чынам:

– спачатку вучні паўтараюць тэарэтычны матэрыял: як вызначыць род назоўнікаў, род якіх назоўнікаў у беларускай мове не супадае з рускай мовай;

– затым абменьваюцца інфармацыяй па выкананні задання, тлумачаць алгарытм выканання сваіх дзеянняў;

– калі ў кагосьці ўзнікаюць цяжкасці ў працы з тэарэтычным матэрыялам або пры выкананні задання, астатнія вучні аказваюць яму неабходную дапамогу.

Настаўнік яшчэ раз нагадвае навучэнцам, што трэба добра засвоіць неабходнае правіла і навучыцца вызначаць род назоўнікаў, паколькі яны становяцца ***экспертамі*** ў сваім заданні і будуць кантраляваць правільнасць яго выканання ў іншых навучэнцаў, калі вернуцца ў сваю першапачатковую групу.

На гэтым этапе яшчэ неабходна звярнуць увагу на ***асаблівасці*** рэалізацыі ***групавой працы***. Трэба арганізаваць працу ў групе такім чынам, каб усе навучэнцы па чарзе прагаварылі неабходны матэрыял, задалі адзін аднаму пытанні. Так, напрыклад, праца навучэнцаў у групах можа адбывацца наступным чынам: ***1-шы вучань*** вызначае род першага назоўніка і задае пытанне пра род другога назоўніка ***вучню 2*** → ***2-гі вучань*** адказвае на пытанне і задае новае пытанне ***вучню 3*** → ***3-ці вучань*** адказвае на пытанне і г. д.

Пакажам на прыкладзе каманд удзельнікаў з розным узроўнем матывацыі, як адбываецца праца ў іх групах, каб кожны ўдзельнік змог стаць экспертам.

***Група навучэнцаў з нізкім узроўнем матывацыі***, якія выконвалі заданне № 1, працавала наступным чынам.

***В. 1*** *(1-шы з першай першапачатковай каманды):* Вызначаем род назоўніка *дзядзька*. Да назоўніка *дзядзька* можна падставіць словы ***ён, мой***, значыць, гэта назоўнік мужчынскага роду. Які род мае назоўнік *тата*?

***В. 2*** *(1-шы з другой першапачатковай каманды):* Да назоўніка *тата* можна падставіць словы ***ён, мой***, значыць, гэта назоўнік мужчынскага роду. Які род мае назоўнік *верталёт*?

***В. 3*** *(1-шы з трэцяй першапачатковай каманды):* Да назоўніка *верталёт* таксама можна падставіць словы ***ён, мой***, значыць, гэта таксама назоўнік мужчынскага роду. Які род мае назоўнік *хлопчык*?

***В. 4*** *(1-шы з чацвёртай першапачатковай каманды)*: Да назоўніка *хлопчык* можна падставіць

словы ***ён, мой***, значыць, гэта назоўнік мужчынскага роду. Які род мае назоўнік *дачка*?

***В. 5*** *(1-шы з пятай першапачатковай каманды):* Да назоўніка *дачка* можна падставіць словы ***яна, мая***, значыць, гэта назоўнік жаночага роду. Якое слова тут лішняе?

***В. 1*** *(1-шы з першай першапачатковай каманды):* Тут лішняе слова *дачка*, таму што яно жаночага роду, а ўсе астатнія назоўнікі — мужчынскага.

***Група навучэнцаў з высокім узроўнем матывацыі***, якія выконвалі заданне № 5, працавала наступным чынам.

***В. 1*** *(5-ты з першай першапачатковай каманды):* Вызначаем род назоўніка *жырафа*. Да назоўніка *жырафа* можна падставіць словы ***яна, мая***, значыць, гэта назоўнік жаночага роду. Які род мае назоўнік *бабуля*?

***В. 2*** *(5-ты з другой першапачатковай каманды):* Да назоўніка *бабуля* можна падставіць словы ***яна, мая***, значыць, гэта назоўнік жаночага роду. Які род мае назоўнік *сабака*?

***В. 3*** *(5-ты з трэцяй першапачатковай каманды):* Да назоўніка *сабака* можна падставіць словы ***яна, мая***, значыць, гэта таксама назоўнік жаночага роду. Які род мае назоўнік *гусь*?

***В. 4*** *(5-ты з чацвёртай першапачатковай каманды):* Ты памыліўся. Назоўнік *сабака* ў беларускай мове мужчынскага роду: ***сабака (ён, мой)***. Да назоўніка *гусь* можна падставіць словы ***яна, мая***, гэта назоўнік жаночага роду. З назоўнікамі *сабака* і *гусь* трэба быць уважлівымі, таму што іх род у беларускай і рускай мовах не супадае. Які род мае назоўнік *лодка*?

***В. 5*** *(5-ты з пятай першапачатковай каманды):* Да назоўніка *лодка* можна падставіць словы ***яна, мая***, значыць, гэта назоўнік жаночага роду. Якое слова тут лішняе?

***В. 1*** *(5-ты з першай першапачатковай каманды):* Тут лішняе слова *сабака*, таму што яно мужчынскага роду, а ўсе астатнія назоўнікі — жаночага.

***Н.:*** Давайце яшчэ раз назавём назоўнікі, род якіх у беларускай і рускай мовах не супадае.

Удзельнікі групы просяць адказаць на гэтае пытанне вучня, які памыліўся пры выкананні задання.

**Пяты этап.** Пасля абмеркавання ўсіх магчымых цяжкасцей, выяўлення памылак у выкананні заданняў і прычын іх узнікнення, выпраўлення памылак эксперты (усе навучэнцы) вяртаюцца ў свае першапачатковыя групы (каманды).

**Шосты этап.** Кожны ўдзельнік каманды па чарзе называе род прапанаваных назоўнікаў, расказвае правіла, якое ён выкарыстаў пры выкананні задання, і алгарытм сваіх дзеянняў.

**Сёмы этап.** Усе астатнія навучэнцы ў камандзе ўважліва слухаюць тлумачэнне выкананага задання сваіх партнёраў, па ходзе тлумачэння робяць запісы ў сшытках. Калі нешта незразумела, задаюць пытанні таму, хто выступае.

Навучэнцы зацікаўлены ў тым, каб кожны ўдзельнік каманды добрасумленна выканаў сваё заданне: яны адказваюць не толькі за правільнасць выканання свайго задання, але і ўсіх заданняў, якія выконвалі ўдзельнікі іх каманды.

**Восьмы этап.** Падвядзенне вынікаў.

Пры падвядзенні вынікаў настаўнік можа папрасіць некалькіх вучняў з розных каманд выканаць любое з прапанаваных заданняў.

**Дзявяты этап.** Рэфлексія якасці засваення матэрыялу, сумеснай дзейнасці і ўзаемадзеяння ў камандзе і ў новых групах.

Настаўнік прапануе пытанні для абмеркавання:

— Ці спадабалася вам працаваць у камандзе?

— Ці спадабалася вам працаваць у групе экспертаў?

— Ацаніце свае дасягненні пры выкананні заданняў індывідуальна, у камандзе, у групе экспертаў.

— Хто задаволены сваёй працай?

— Падніміце рукі, хто запомніў усе неабходныя правілы і можа іх прымяняць.

— Падніміце рукі, хто ўмее вызначыць род усіх прапанаваных назоўнікаў.

Настаўнік па сваім меркаванні можа задаць некаторыя з прадстаўленых пытанняў.

Выкарыстанне варыянту ***тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве*** «***Піла***» на ўроках беларускай мовы ***магчыма не толькі пры замацаванні матэрыялу, але і падчас працы, накіраванай на фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.*** Пакажам варыянт рэалізацыі прапанаванай тэхналогіі на ўроках беларускай мовы падчас працы з прыказкамі.

Паколькі *большасць этапаў тэхналогіі, апісаных вышэй, не маюць прынцыповага адрознення, больш падрабязна мы разгледзім толькі другі, трэці і чацвёрты этапы*, у якіх прапануюцца заданні, накіраваныя на фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

**Другі этап.** Удзельнікам кожнай каманды прапануюцца для выканання заданні па пэўных пытаннях адной тэмы.

Заданні для каманд можна запісаць на дошцы, размясціць на слайдзе ці ў канверце на картках.

**1.** ***Заданне для ўсіх навучэнцаў, незалежна ад прысвоенага ім нумара.***

Прачытайце прыказкі і растлумачце іх сэнс.

**2.** Знайдзіце ў прыказках дзеясловы і пастаўце да іх пытанні.

**№ 1:**

Хто не сее, у таго не расце [4, с. 119];

**№ 2:**

Век жывеш, век вучышся [4, с. 98];

**№ 3:**

Колькі робіш — столькі вучышся [4, с. 98];

**№ 4:**

Хваляць за добрае, ганяць за кепскае [4, с. 104];

**№ 5:**

Згода будуе, нязгода руйнуе [4, с. 104];

**№ 6:**

Рана не ўстанеш — многа не зробіш [4, с. 119].

**Трэці этап.** Капітаны каманд з дапамогай настаўніка размяркоўваюць, якое заданне будзе выконваць кожны з навучэнцаў.

Удзельнікі каманды працуюць самастойна над сваім заданнем.

**Чацвёрты этап.** Навучэнцы, якія працуюць над адным і тым жа заданнем, але ў розных камандах, перамяшчаюцца і збіраюцца ў новыя групы.

У кожнай новай групе праца навучэнцаў адбываецца наступным чынам:

– спачатку навучэнцы чытаюць прыказку і тлумачаць яе сэнс;

– далей яны паўтараюць тэарэтычны матэрыял: што такое дзеяслоў; на якія пытанні адказвае дзеяслоў.

– затым абменьваюцца інфармацыяй па выкананні задання, тлумачаць алгарытм выканання сваіх дзеянняў;

– калі ў кагосьці ўзнікаюць цяжкасці ў працы з тэарэтычным матэрыялам або пры выкананні задання, астатнія вучні аказваюць яму неабходную дапамогу.

Пакажам на прыкладзе каманды ўдзельнікаў з ***сярэднім узроўнем матывацыі***, як адбываецца праца ў іх групе.

***Група навучэнцаў з сярэднім узроўнем матывацыі****,* якія выконвалі заданне № 4, працавала наступным чынам.

***В. 1*** *(4-ты з першай першапачатковай каманды):* Нам трэба прачытаць прыказку і растлумачыць яе сэнс. Хваляць за добрае, ганяць за кепскае. «Хваляць за добрае» — гэта значыць, што калі чалавек робіць добрую справу, то яго абавязкова за гэта хваляць. Што азначаюць словы «ганяць за кепскае»?

***В. 2*** *(4-ты з другой першапачатковай каманды):* «Ганяць за кепскае» — гэта значыць, калі хтонебудзь дрэнна нешта зрабіў, то яго будуць асуджаць. Якія словы мы называем дзеясловамі?

***В. 3:*** *(4-ты з трэцяй першапачатковай каманды):* Я памятаю, што «ганяць» — гэта азначае «саромяць», а не «асуджаюць». І выраз «ганяць за кепскае» — гэта значыць, саромяць за дрэнныя справы. Дзеясловамі называюць словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў. На якія пытанні адказваюць дзеясловы?

***В. 4*** *(4-ты з чацвёртай першапачатковай каманды):* Дзеясловы адказваюць на пытанні *што робіць?, што робяць?, што рабіў?, што зрабіў?, што зробіць?* і іншыя. Якія словы ў прыказцы з'яўляюцца дзеясловамі?

***В. 5*** *(4-ты з пятай першапачатковай каманды):* «Хваляць» і «ганяць». Якія пытанні да іх можна паставіць?

Удзельнікі групы просяць адказаць на гэтае пытанне вучня, які памыліўся пры выкананні задання.

***В. 2*** *(4-ты з першай першапачатковай каманды):* (Што робяць?) хваляць, (што робяць?) ганяць.

***В. 1*** *(4-ты з першай першапачатковай каманды):* Давайце падкрэслім дзеясловы і запішам пытанні да іх.

Такім чынам, праца з прыказкамі, рэалізаваная па варыянце ***тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Піла»***, на ўроках беларускай мовы не толькі спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, але дапамагае замацаваць неабходны тэарэтычны матэрыял.

Падводзячы вынік усяго вышэйапісанага, можна адзначыць, што выкарыстанне варыянту «Піла» тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве на ўроках беларускай мовы дазваляе:

*педагогу:*

– ствараць натуральныя ўмовы для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі;

– узмацняць жаданне навучэнцаў лепш запамінаць вучэбны матэрыял, каб быць экспертам і не падводзіць сваю каманду;

– вучыць навучэнцаў рабіць рэфлексію сваіх поспехаў у засваенні ведаў і спосабаў выканання прапанаваных заданняў;

– выхоўваць адказнасць у кожнага навучэнца за якасць засваення вучэбнага матэрыялу, за выкананне сваіх абавязкаў, а таксама за поспехі сваіх сяброў па камандзе;

*навучэнцам:*

– ацэньваць узровень сваіх ведаў і ўменняў, а таксама ведаў і ўменняў удзельнікаў каманды і пры неабходнасці карэкціраваць іх;

– добразычліва і ветліва ставіцца да ўдзельніка каманды, які адчувае цяжкасці ў выкананні заданняў;

– вучыцца аказваць дапамогу адзін аднаму, калі ўзнікаюць цяжкасці пры выкананні заданняў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Казимирская, И. И.* Обучение в сотрудничестве / И. И. Казимирская, А. В. Торхова // Организация и стимулирование самостоятельной работы студентов по педагогике : учеб. пособие. — Минск : Бестпринт, 2004. — С. 234–281.
2. *Мурашка, Н. У.* Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве на ўроках як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі беларускай мовы ў І класе / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2020. — № 8. — С. 25–29.
3. *Мурашка, Н. У.* Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі літаратурнага чытання ў ІІ класе / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2021. — №. 4. — С. 43–46.
4. *Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова : вучэб. дапаможнік для 3 кл. устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — Ч. 2. — 144 с. : іл.